**ПЯТРО́**, Пятроў дзень, Пятро і Павел, Пётра і Паўла, свята *народнага календара* ў гонар святых апосталаў Пятра і Паўла. Адзначалася 12 ліпеня (н. ст.). П. і Павел уяўляліся памочнікамі сялян у земляробчых занятках летняга перыяду: у касьбе (зялёных пакосаў — «З Пятрова дня ў полі пажня»; «Святы Пётра ў косы звоніць, святы Паўла граблі робіць», «Святы Пятро талаку збіраў копы сена вазіць, стагі мятаць»), у працы на пашы і ў агародзе («Святы Пятро папары барануець, поле раўнуець, грунт гатуець»; падкопваюць маладую бульбу, перастаюць матычыць капусту), у падрыхтоўцы да жніва («Святы Пётра сярпы вострa»). П. выступае як апякун нівы, асабліва грэчкі, якую сеюць за некалькі дзён да свята і якую ён палівае, нягодзячы адначасова на жніве і на касавіцы. Ён садзейнічае выспяванню ўраджаю: «Святы Пятро жыта налівае, рой адсылае», «Святы Пятро жытцо спеліць», «Святы Пятро — жыта ядро». Са з'яўленнем каласоў у злаках звязвалі ў гэты дзень (ці таксама на Купалле) завяршэнне кукавання зязюлі, якая нібыта «падавілася ячменным коласам»:

Кукуй, зязюлька, не маўчы,
А нямнога ж табе кукаваці —
Ад Вялікадня да Пятра,
Ад цёмнай ночкі аж да дня.
Як стане ячмень выплываць,
Кідай, зязюлька, кукаваць.

На П. зязюля магла падавіцца не толькі коласам, але і сырам, паколькі са святам заканчваўся *Пятроўскі пост* (Пятроўка), і можна было разгавецца скаромным: «Жджы Пятра — сыр з'ясі!» Паводле нар. уяўленняў, зязюля ў гэты дзень ператвараецца ў коршака: «Да Пятра куе, а пасля Пятра курэй дзярэ». Па больш раннім ці запозне-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ным у дачыненні да дня П. замаўканню зязюлі меркавалі пра характар пор года: калі яна кукуе пасля П. — чакай цёплай, пагоднай восені, няскорага выпадзення снегу; калі замоўкне да П. — будзе халодная восень і ранняя зіма. Метэаралагічныя і ўраджайныя прадказанні рабіліся і па стане надвор'я ў гэты дзень: «На Пятро дождж — будзе жыта, як хвошч, ...сенакос мокры, ...на Новы год будзе страшная мяцеліца»; «Калі Пётра з Паўлам плачуць, дык людзі праз тыдзень свету не ўбачаць». Аграрна-магічная семантыка свята П. спалучалася са шлюбнай. Пасля заканчэння Пятроўкі пачыналі спраўляць вяселлі: «К Пятру і дачку абяру» або «Дзеўка хітра да Пятра», г. зн. імкнецца спадабацца хлопцу, каб выйсці замуж, а пасля свята зноў мусіць чакаць, пакуль надыдзе пара сустракаць сватоў. Пераважна любоўным зместам былі напоўнены *пятроўскія песні*, якія гучалі ў час гэтага свята і тэматычна працягвалі купальскія. Ва ўсходняй Беларусі на П. адбываўся абрад *Кумавання* (Кумлення): дзяўчаты абменьваліся пярсцёнкамі, завушніцамі, хусткамі і на працягу года лічыліся кумамі. Гэты абрад суправаджаўся ўжываннем рытуальных страў, гульнямі з карагодамі, распальваннем вогнішчаў і гушканнем на арэлях, варажбою. Дзяўчаты ішлі ў гаі «развіваць вянкі», завітыя на *Сёмуху* і, пацалаваўшыся праз іх, «кумаваліся», выбіраючы сабе сяброўку на год. У шматлікіх павер'ях, прыкметах, прыказках свята П. найчасцей суадносілася з днём *Ільі*: «Святы Пятро ўкаласіўся, а святая Ілля жыта жала»; «Пётр з каласком, Ілля з калабком»; «На Пятра — крышку хлеба напякла, на Ілллю — поўну печ хлеба наллю» (г. зн. ужо напоўніцу можна спажываць плён нівы). Пра тое, што лета пачало ісці на спад, гавораць прыкметы: «Пётр-Павел час убавіў, Ілля-прарок — два ўвалок», «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйшоў Ілля — апала два», «Прыйшоў Барыс — асыпаўся ўвесь ліст», «Прыйшоў Спас — скіне ўсіх нас!» і г.д. Як і на Ільлю, на П. дзе-нідзе асцерагаліся купацца. На Гомельшчыне сцвярджалі, што ў гэты дзень Сож адбірае 25 чалавек на ахвяру Богу. На Вілейшчыне П. лічыўся адным з памінальных дзён, калі належыць адведваць могілкі.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 487—490; Васілевіч У. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993. С. 36—37; Купальскія і пятроўскія песні. Мн., 1985.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ